International Project co-financed by the European Commission, EuropeAid

Bridge

Fostering mutual understanding and co-operation of the EU with Belarus, Moldova, Russia and Ukraine 2008 - 2012

# Дэкларацыя аб ўзаемаадносінах Беларусі і ЕС

**Прынята на Міжнародным семінары па праекце БРЫДЖ.**
**«Павышэнне ўзроўню ўзаемаразумення і ўзаемадзеяння краін ЕС з Беларуссю, Малдовай, Расіяй і Украінай »**[1]

Семінар праходзіў 1-2 кастрычніка 2009 года ў Беларускім гандлёва-эканамічным універсітэце спажывецкай кааперацыі (БГЭУ), Гомель, Беларусь пад кіраўніцтвам рэктара БГЭУ дац., к.э.н. Навумчык А.А., члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

У рабоце семінара прынялі ўдзел 43 высокакваліфікаваныя эксперты - прадстаўнікі універсітэтаў і іншых устаноў - з пяці абласцей Беларусі, а таксама ў якасці дакладчыкаў 5 экспертаў - прадстаўнікоў арганізацый членаў кансорцыума па праекце БРЫДЖ.

Абмяркоўваючы пытанні праграмы семінара, удзельнікі бралі пад увагу той факт, што Рэспубліка Беларусь - у сілу гістарычных, эканамічных, геапалітычных і іншых прычын - зацікаўлена ў рознабаковых ўзаемаадносінах як з Расійскай Федэрацыяй, так і з ЕС. Пасля двух дзён дыскусій і абмену думкамі ўдзельнікі прынялі наступныя рэкамендацыі адносна ўзаемаадносінаў Беларусь-ЕС:

1. Удзельнікі адабраюць і падтрымліваюць палітыку ўзаемаразумення і супрацоўніцтва паміж ЕС і Рэспублікай Беларусь. Яны прымаюць рашэнне сесіі Савета Міністраў замежных спраў Еўрапейскага Саюза ў Люксембурзе ад 13 кастрычніка 2008 года ў частцы аднаўлення палітычнага дыялогу.

2. Удзельнікі выказваюць імкненне да прыняцця адпаведных інструментаў (сродкаў) рэгулявання адносін паміж ЕС і Беларуссю як у межах Еўрапейскай палітыкі добрасуседства і Усходняга партнёрства, так і ў парадку двухбаковых сувязяў. Гэтыя інструменты (сродкі) павінны

[1] Праект БРЫДЖ фінансуецца EuropeAid Еўрапейскай камісіі. Каардынатар праекта доктар, праф. Сільва Дзеветак, Прэзідэнт ISCOMET - Інстытут этнічных і рэгіянальных даследаванняў, горад Марыбар, Славенія. Членамі кансорцыума БРЫДЖ з'яўляюцца універсітэты і няўрадавыя арганізацыі Беларусі, Германіі, Італіі, Малдовы, Румыніі, Расіі, Славеніі і Украіны.

забяспечыць трывалы заканадаўчы і палітычны базіс для развіцця супрацоўніцтва ў будучым ў інтарэсах як Беларусі, так і ЕС.

3. Удзельнікі вераць, што эканамічнае і палітычнае супрацоўніцтва будзе ўстойлівым і больш эфектыўным у кантэксце канструктыўнага дыялогу па развіцці правоў чалавека і асноўных свабод, свабоды думкі, свядомасці і рэлігіі, удзел у прыняцці рашэнняў, свабоды самавыяўлення і інфармацыі, мадэрнізацыі грамадзянскай супольнасці і больш эфектыўным грамадскім кіраванні. З гэтай мэтай яны падтрымліваюць вынікі першага этапа дыялогу па правах чалавека, праведзенага ў маі 2009 года ў Празе.

4. Удзельнікі просяць арганізацыі ЕС і Беларусі знайсці як мага хутчэй адэкватныя рашэнні для спрашчэння візавага рэжыму як першага кроку на шляху да адмены візаў, каб ліквідаваць перашкоды для кантактаў паміж людзьмі і асабліва паездак у ЕС.

5. Удзельнікі выказалі меркаванне аб карыснасці арганізацыі семінараў для навукоўцаў, кіраўнікоў грамадскіх арганізацый, інстытутаў і членаў мясцовых органаў кіравання па Еўрапейскай інстытуцыянальнай структуры на ўсіх узроўнях. Таксама ЕС неабходна прадаставіць магчымасці для навучання прадстаўнікоў беларускіх рэгіянальных, мясцовых органаў кіравання і інстытутаў з мэтай ўключэння чалавечых рэсурсаў у праекты і праграмы, якія фінансуюцца ЕС.

6. Удзельнікі прызнаюць, што ліквідацыя неабгрунтаваных бар'ераў для беларускага экспарту з'яўлялася б важным крокам наперад у адносінах Беларусі з ЕС. Значным крокам у гэтым накірунку магло б быць аднаўленне ўдзелу Беларусі ў Абагульненай сістэме гандлёвых прэферэнцый Еўрасаюза. Сёння ЕС прымяняе да Беларусі гандлёвае пагадненне, якое прымяняецца да прамыслова развітых краін, што наносіць шкоду эканамічным інтарэсам Беларусі і яе ўсходнім партнёрам.

7. Удзельнікі ўсведамляюць важнасць супрацоўніцтва паміж Беларуссю і ЕС у сферы экалагічнай палітыкі і экалагічных праграм. Яны

прапаноўваюць, каб праект такога плану быў уключаны ў бягучыя і будучыя накірункі супрацоўніцтва. У гэтым плане каштоўным было б, напрыклад, стымуляванне адпаведнымі спосабамі ўвядзення ў Беларусі энергазберагальных тэхналогій і вопыту выкарыстання ў ЕС аднаўляльнай і альтэрнатыўнай энергіі.

8. Удзельнікі лічаць, што праект БРЫДЖ, які фінансуецца EuropeAid Еўрапейскай камісіі, з'яўляецца вельмі важнай, канструктыўнай і актуальнай ініцыятывай, якая на самой справе спрыяе развіццю добрасуседскіх адносін у Еўропе і, у прыватнасці, усталяванню двухбаковых і шматбаковых добразычлівых кантактаў паміж экспертамі, прафесарамі, студэнтамі, кіраўнікамі грамадзянскага грамадства, членамі мясцовых органаў кіравання і падобных катэгорый насельніцтва па абодвух баках знешніх межаў ЕС. Прафесар, доктар Сільва Дзеветак і яго каманда распрацавалі вельмі эфектыўныя заключэнні і абмен інфармацыяй, якія з'яўляюцца перадумовай для больш цеснага супрацоўніцтва. Што тычыцца Беларусі, то праект БРЫДЖ садзейнічае ў беларускім грамадстве мэтам і дасягненням ЕС, і, трэба спадзявацца, будзе прапаноўваць адпаведным структурам ЕС і кампаніям краін ЕС таксама і беларускія праекты і прапановы супрацоўніцтва. Удзельнікі выказалі думку, што будзе магчыма дасягнуць да заканчэння праекта БРЫДЖ ў 2012 годзе значных вынікаў па кансалідацыі сітуацыі і развіцці супрацоўніцтва на Еўрапейскім кантыненце. Удзельнікі паўторна пацвярджаюць ў гэтым кантэксце сваё перакананне, што межы ЕС не павінны быць «раздзяляльнымі лініямі», яны павінны быць лініямі сяброўства і добрасуседства паміж дзяржавамі.

9. Удзельнікі папрасілі прафесара, доктара Сільва Дзеветака як Каардынатара праекта БРЫДЖ распаўсюдзіць гэтую Дэкларацыю сярод адпаведных арганізацый ЕС, Беларусі і краін-членаў ЕС.

Гомель, 2 кастрычніка, 2009.